# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

## 65 гадоў

**Вітка, В. Буслінае лета : [Казка : для малодш. узросту] / Васіль Вітка; мал. В. Варанецкага. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры, 1958. – 56 с.**






# 65 гадоў : «Буслінае лета»



Як я пачаў складаць казку

Ціха так,
Хоць сей ты мак.
Я сяджу ў градзе гароху.
Рву сабе стручкі патроху,
А паблізу, на аселіцы,
Нехта цвеліцца і цвеліцца:
То ляскоча
Безупынна,
То сакоча
Гэтак шпарка,
Як матор якой машыны
Ці калгасная жняярка,
Раз-па-разу: чах-чах-чах.
Што такое?
Проста страх.

Толькі глянуў я на вяз,
Што за вуліцай у нас,—
Зразумеў, адкуль той клёкат:
У гняздзе, на відавоку,

2

«Буслінае лета» – другая казка Васіля Віткі, выдадзеная праз дзесяць гадоў пасля першай дзіцячай кнігі «Вавёрчына гара».

Галоўны герой у «Бусліным леце» – школьнік Васіль, які скончыў 3 класы. Настаўніца задала заданне – «даць прыроды апісанне». Васіль хоча напісаць казку пра буслоў. Ён робіць першыя запісы ў сшытку і хавае яго ў дупло вяза, але сшытак некуды знікае… Далейшае развіццё сюжэта «будуецца» на яго пошуках. Васіль знаёміцца, а потым і сябруе з разумным, прыветным і добразычлівым буслам і яго сям’ёй. Па запрашэнні бусла хлопчык трапляе ў буслянку, бачыць побыт сям’і буслоў, у якой вялікая ўвага ўдзяляецца птушанятам. Яны добра выхаваны. Напрыклад, калі бацька бусел прадстаўляў Васілю буслянят, дык кожнае з іх «уставала і на ножках прысядала»… У казку ўключаны пазнавальны матэрыял: расказваецца, як робіцца буслянка, як жывуць, чым кормяцца буслы, як яны ловяць рыбу, гадзюк, якую карысць прыносяць чалавеку.

Пазней герой «Буслінага лета» з’явіцца і ў «Казцы пра цара-зубра», у якой атрымае прозвішча Вясёлкін. З цягам часу Вася Вясёлкін стане кумірам многіх пакаленняў дзяцей...

# 65 гадоў : «Буслінае лета»

Першае выданне «Буслінага лета» мела вялікую колькасць малюнкаў, якія выканаў вядомы мастак-графік В.А. Варанецкі (1912–1974).







